**К. П. Любецкая** (Мінск, Беларусь)

# БЕЛАРУСКАЕ ДЫЯЛЕКТНАЕ ТЭРМІНАЗНАЎСТВА

Беларуская навуковая тэрміналогія, якую прынята лічыць «паказчыкам сталасці нацыі» (Сцяцко, 2005) неаднойчы з'яўлялася аб'ектам аналізу ў айчыннай лінгвістыцы. Хоць у беларускім мовазнаўстве значна вырас аб'ём тэрміналагічных ведаў, сёння вырашэнне задачы філіяцыі беларускага тэрміназнаўчага ведання знаходзіцца ў самым пачатку. Як вядома, «філіяцыя ў тэрміназнаўстве ідзе па аб'ектыўна-прадметнай аснове: агульнае тэрміназнаўства, галіновае тэрміназнаўства, рэфлексіўнае тэрміназнаўства (гісторыя і тэорыя тэрміназнаўства), дэскрыптыўнае тэрміназнаўства, прэскрыптыўнае тэрміназнаўства, тыпалагічнае тэрміназнаўства, супастаўляльнае тэрміназнаўства, анамасіялагічнае тэрміназнаўства, семасіялагічнае тэрміназнаўства, дыяхранічнае тэрміназнаўства, функцыянальнае тэрміназнаўства, функцыянальнае тэрміназнаўства, прыкладное тэрміназнаўства і інш.» (Татаринов, 2001). Вызначэнне вектараў ажыццёўленых тэрміналагічных даследаванняў, размежаванне наяўных падыходаў да вывучэння спецыяльнай лексікі беларускай мовы істотна не толькі ў плане інвентарызацыі і сістэматызацыі назапашанага вопыту, але важна для пераходу ад назіранняў і абагульненняў да аналізу ўласцівых заканамернасцей і ў далейшым мэтанакіраванага планавання. Асэнсаванне праблем, паказальных для айчыннага тэрміназнаўства, дазваляе меркаваць не толькі пра прыярытэтныя кірункі ажыццёўленых даследаванняў, але і спрыяе ў цэлым акрэсленню спецыфікі нацыянальнага тэрміназнаўства. Праблема тыпалогіі беларускамоўнага тэарэтычнага тэрміназнаўства яшчэ далёкая ад свайго вырашэння. Прычына гэтага палягае найперш у шматаспектнасці праведзеных даследаванняў, што значна абцяжарвае вылучэнне так званай дамінантнай прыкметы пры класіфікацыі ажыццёўленых прац у галіне тэрміналогіі. Фактычна сёння можна весці гаворку пра прынцыповую бясконцасць падыходаў да тыпалогіі. Аўтары, аналізуючы розныя аспекты спецыяльнай лексікі, працуюць у розных філіяцыях, не абмяжоўваючы сябе строгімі межамі асобнага напрамку. Увогуле, навукоўцамі адзначаецца «поліпарадыгмальнасць сучаснага мовазнаўства, а ў выніку і тэрміназнаўства як аднаго з яго структурных падраздзелаў і цалкам самадастатковай навуковай дысцыпліны» (Івашчанка, Казімірава, 2013).

У межах прадстаўленага артыкула спынімся на асэнсаванні аднаго з кірункаў айчыннага тэрміназнаўства – дыялектнага. Натуральна, што ў межах артыкула немагчыма ахапіць усе даследаванні ў сферы беларускага тэрміназнаўства, таму абмяжуемся аналітычным аглядам дысертацыйных прац (1990–2017), што прынята далучаць да прац так званага рэпрэзентатыўнага характару.

Аўтары навуковых прац перакананы, што значнасць праведзеных даследаванняў перадусім ва ўвядзенні ў навуковы ўжытак лексічнага матэрыялу, не зафіксаванага ў дыялектных выданнях, які пры гэтым адлюстроўвае нацыяльную спецыфіку мовы. Цікавасць да вывучэння разнастайных лексіка-тэматычных груп істотна для навукі, бо «можа знікнуць тое, што

складае непаўторную каштоўнасць народа, значную частку яго духоўнай культуры» [1, с. 3]. Акрамя гэтага, вучоныя лічаць, што прааналізаваная імі шматлікая і разнастайная сістэма найменняў можа выкарыстоўвацца як адна з крыніц папаўнення тэрміналогіі літаратурнай мовы. На думку навукоўцаў, шматаспектны лінгвістычны аналіз спрыяе вырашэнню тэарэтычных і практычных пытанняў дыялекталогіі, лексікалогіі, лексікаграфіі, стылістыкі, словаўтварэння і г.д.

У традыцыях дыялектнага тэрміназнаўства лінгвісты вывучаюць асобныя групы лексікі: лексіка цяслярскага і сталярнага рамёстваў (Кніга, 1995), лексіка хатняга жаночага рамяства (Казачэнка, 1996), тэрміналогія аўтамабільнага транспарту (Мінакова, 1999), лексіка воднага транспарту (Аніськова, 2000), народная лексіка ткацтва (Трухан, 2001), канфесіянальная лексіка (Шаўчэнка, 2001), метэаралагічная лексіка (Новік-Шчарбенка, 2003), лексіка народнай медыцыны (Мазуркевіч, 2003), сельскагаспадарчая тэрміналогія (Лаўшук, 2003), энтамалагічныя назвы (Бунько, 2005), батанічная наменклатура (Кісель, 2010), лексіка народных промыслаў і рамёстваў (Макарэвіч, 2012). Варта адзначыць пры гэтым, што пад увагу браліся працы, прысвечаныя вывучэнню не толькі выключна спецыяльнай лексікі, але і асэнсаванню гісторыі развіцця пэўных лексіка-семантычных груп. У гэтым выпадку цалкам пагаджаемся з укладальнікамі «Паказальніка тэрміналагічных дысертацый» (2006), якія сцвярджаюць, што «ў сучасны час практычна кожны назоўнік (за выключэннем стылістычна афарбаваных) абазначае і паняцце або спецыяльнае ўяўленне, што з'яўляецца прадметам даследавання той або іншай навукі... У перыяд да фарміравання навукі, спецыяльная лексіка адпаведнай галіны ведаў існуе ў выглядзе лексіка-семантычнай групы...» [2, с. 11].

Дамінуючым вектарам у межах дыялектнага тэрміназнаўства становіцца разгляд такіх пытанняў, як а) прадметна-тэматычная класіфікацыя найменняў спецыяльнай лексікі; б) акрэсленне семантычнага аб'ёму лексем; в) сістэмныя адносіны ў тэрміналогіі (гіпанімія, полісемія, антанімія, сінанімія, аманімія). Варта адзначыць пры гэтым, што амаль стандартны аналіз груп рэгіянальнай лексікі спрыяў уніфікацыі прыёмаў апісання.

У традыцыях тэарэтычнага тэрміназнаўства навукоўцы асэнсоўваюць паняцці тэрмін, тэрміналогія, сістэмнасць тэрмінаў. Абмеркаванне праблем тэарэтычных асноў тэрміналогіі, бясспрэчна, стымулявала станаўленне тыпалагічнага тэрміназнаўства, скіраванага перадусім на вытлумачэнне працэсаў, што адбываюцца падчас упарадкавання тэрміналогіі.

Адна з тэм – гэта лексіка-семантычны аналіз пэўнай групы спецыяльных найменняў, лексіка-семантычная характарыстыка тэрмінаў. Бясспрэчна, на карысць развіцця айчыннай навукі аб тэрмінах спрацоўвае асэнсаванне адрозненняў у семантычных працэсах, што адбываюцца ў спецыяльнай і неспецыяльнай лексіцы. Традыцыйна пры гэтым разглядаюцца такія лексіка-семантычныя з'явы, як сінанімія, дублетнасць, варыянтнасць, полісемія, аманімія, антанімія.

Асобнай тэмай для вывучэння стала акрэсленне найбольш прадуктыўных словаўтваральных мадэлей і спосабаў утварэння спецыяльных

намінацый. Пры разглядзе спосабаў утварэнняў тэрмінаў (сінтаксічнага, лексіка-сінтаксічнага, марфалагічнага) увага звяртаецца на спосабы ўтварэння спецыяльных найменняў у беларускіх гаворках. Дзякуючы асэнсаванню структурнага аспекта тэрмінаў падкрэсліваюцца спецыяльныя асаблівасці тэрміналогіі. Традыцыйны зварот даследчыкаў да вырашэння гэтай праблемы спрыяе ўстанаўленню агульных заканамернасцей тэрмінаўтварэння, упарадкаванню асобных тэрмінагалін, а таксама стымулюе выпрацоўку рэкамендацый па стварэнні новых тэрмінаадзінак, паколькі на аснове аналізу можна весці гаворку аб тэндэнцыях і заканамернасцях тэрмінаўтварэння пэўнай тэрмінасферы.

Аўтары, як правіла, спыняюцца на высвятленні пашырэння рэгіянальнай спецыяльнай лексікі ў народных гаворках, вызначэнні іх месца у беларускай нацыянальнай мове. Выяўляюцца асноўныя заканамернасці функцыянавання і развіцця спецыяльных найменняў за межамі даследаванага рэгіёна, акрэсліваецца іх пашыранасць у беларускай мове. У частцы даследаванняў аналізуецца лінгвагеаграфічнае размеркаванне спецыяльнай лексікі, арэальныя ўзаемасувязі паміж спецыяльнымі назвамі.

Дыялектнае тэрміназнаўства ўзбагачаецца таксама праблемай этымалогіі, паходжання спецыяльных намінацый, іх генетычнага аналізу.

Асобная ўвага навукоўцаў звяртаецца на скрупулёзнае апісанне крыніц і шляхоў тэрміналогіі, праблему запазычання.

Адметным для дыялектных тэрміназнаўчых прац з'явілася ўключэнне ў іх структуру лексікаграфічных матэрыялаў перакладнога або тлумачальнага характару.

Такім чынам, разгляд праблематыкі у сферы вывучэння беларускай спецыяльнай лексікі даюць падставы прыйсці да наступных высноў. Тэрміназнаўчае поле ў беларускім дыялектным тэрміназнаўстве ў гэты перыяд характарызуецца шматпланавасцю: у тэрміназнаўчых працах знаходзіць адлюстраванне шырокі дыяпазон заяўленых для вырашэння пытанняў – ад вызначэння агульных тэарэтычных заканамернасцей развіцця асобных тэрмінасістэм да вырашэння практычных задач упарадкавання галіновай лексікі, акрэслення агульных прынцыпаў і метадаў тэрміназнаўчага ведання.

Падагульняючы назіранні, варта адзначыць, што сёння пакуль рана казаць пра тое, што беларускае дыялектнае тэрміназнаўства сфарміравалася ў асобны навуковы кірунак са сваім прадметам даследавання, катэгарыяльным апаратам, метадамі аналізу, праблематыкай і тэндэнцыямі развіцця. Разам з тым зварот навукоўцаў да асэнсавання гэтай часткі спецыяльнай лексікі сведчыць пра запатрабаванасць яе вывучэння для айчыннага мовазнаўства, а таксама пра паступовае развіццё асобнага доследнага поля ў айчынным тэрміназнаўстве.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Мяцельская, Е. С.* Беларуская дыялекталогія : хрэстаматыя / Е. С. Мяцельская, Я. М. Камароўскі. – Минск : Выд-ва БДУ, 1979. – 320 с.
2. Указатель терминологических диссертаций : справ. пособие / С. В. Гринев-Гриневич, [и др.]. – Белосток – Москва, 2006. – 750 с.